Што Кодэкс аб культуры адкрые для развіцця сферы?

13.01.2016 00:40 | Аўтар: Вольга Мядзведзева (/be/tags/volga-myadzvedzeva) / Ларыса Цімошык (/be/tags/larysa-cimoshyk) | Культура (/be/kultura), Дыялог (/be/dyyalog)

У гэтым свеце ўсё падлягае сваім законам. Нават у прыродзе вызначаны поры года: мы разумеем, па якіх правілах жыць, калі лета змяняецца восенню, а далей прыходзіць зіма. Людзі таксама вызначаюць правілы — дзеля таго, каб пазбегнуць непатрэбных нечаканасцяў і пралічыць шляхі на будучыню. Яны пішуць законы. Нашы продкі зразумелі каштоўнасць гэтай справы з часоў Вялікага Княства Літоўскага; мы, іх нашчадкі, высока трымаем марку і ўдасканальваем свае законы.



Заканатворчая дзейнасць — таксама творчасць, якая робіцца шляхам думкі, логікі. Як любая творчасць, яна накіравана на тое, каб паляпшаць, упрыгожваць, гарманізаваць жыццё. Асабліва гэта можна сказаць пра заканадаўства ў галіне культуры: праект Кодэкса аб культуры быў вынесены на абмеркаванне грамадскасці летась, але (як сімвалічна!) павінен быць прыняты ў Год культуры, абвешчаны ў Беларусі. Што прынцыпова новага ён адкрые для развіцця сферы? Якія яе кірункі выклікаюць найбольш клопату? Гэтыя пытанні мы абмяркоўвалі з зацікаўленымі асобамі: тымі, хто заканадаўства піша, і тымі, хто будзе потым па ім жыць.

Біблія культуры

(https://sirop.belteleadm.by/)

ЗВЯЗДА: *Падчас прадстаўлення праекта кодэкса ў Авальнай зале парламента ішла гаворка пра тое, што гэты дакумент — доўгачаканы. Патлумачце, калі ласка, хто яго чакае і чаму?*



Наталля Кучынская, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы

Наталля КУЧЫНСКАЯ: Кодэкс Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» — гэта дакумент, якога чакаюць і творцы, і работнікі культуры, і службовыя асобы, і простыя грамадзяне — карыстальнікі культурных даброт. Абмеркаванне ў Авальнай зале яшчэ раз прадэманстравала, што зацікаўленасць дакументам высокая: дэпутаты задалі больш за дзясятак пытанняў. І жыццёвых, і накіраваных на ўдасканаленне праекта.

Работнікам культуры кодэкс патрэбен як сістэмны дакумент, якім зручна карыстацца, выконваючы свае прафесійныя абавязкі. Дакладна ведаю аб гэтым з сустрэч у маёй выбарчай акрузе.

> Будучы кодэкс павінен стаць заканадаўчым імпульсам для развіцця культуры. Ён змяшчае нормы, якія даюць «зялёнае святло» ўдасканаленню гэтай сферы.

Алена ВЕШТАРТ: Кодэкс будзе карысны не столькі нават спецыялістам, якія добра арыентуюцца ў гэтай сферы, колькі любому грамадзяніну Беларусі: каб ведаць, якія ён мае правы і абавязкі, калі ідзе ў тэатр, бібліятэку або музей…

У праекце мы не проста сабралі ўсе нормы пад адну вокладку, але і сістэматызавалі, абагульнілі іх, ліквідавалі неадпаведнасці. Пастараліся зрабіць дакумент сучасным і зразумелым. Думаю, галоўная яго якасць — даступнасць: ім лёгка будзе карыстацца.

> **Святлана САРОКА:** Культура — гэта душа народа, духоўнае здароўе і кісларод нацыі, імідж нашай краіны. На фарміраванне духоўнага патэнцыялу чалавека, на развіццё сучаснай культуры Беларусі працуюць дзясяткі тысяч самаадданых, таленавітых і апантаных людзей, дзякуючы якім зберагаюцца лепшыя культурныя традыцыі нацыі, з'яўляюцца новыя творы мастацтва.

Культура Беларусі развіваецца, аб ёй ведаюць далёка за межамі краіны. Кодэкс неабходны, каб сістэматызаваць заканадаўства ў сферы культуры, спрасціць яго прымяненне і палепшыць умовы для працы ўстаноў культуры і людзей, якія працуюць у гэтай сферы.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» будзе першым на постсавецкай прасторы і наогул у свеце. Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці правяла маніторынг сярод арганізацый, устаноў культуры і профільных упраўленняў абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў. Мы аналізавалі навуковыя даследаванні, публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, акты заканадаўства замежных дзяржаў, якія рэгулююць культурную дзейнасць. Праект кодэкса быў з самага пачатку размешчаны на сайце Міністэрства культуры і, пачынаючы з этапу абмеркавання яго канцэпцыі, кожны грамадзянін Беларусі можа прапанаваць свае ідэі. Законапраект, нарэшце, прайшоў складаную юрыдычную экспертызу Цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі.

(https://shop.beltelecor



Аляксандр Суша, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці

Аляксандр СУША: Запатрабаванасць кодэкса была зразумелая з самага пачатку.

> Натуральна, што было і пытанне: наколькі патрэбен такі дакумент уласна арганізацыям культуры, а тым больш яе неінстытуцыялізаваным суб'ектам? Але сам па сабе факт наяўнасці ідэі распрацоўкі кодэкса сведчыць пра сталасць заканадаўства і культуры, пра пэўную самапавагу да сябе.

Культура — гэта сфера амаль што неабсяжная. З пункту гледжання навукі, культура — гэта ўсё, што створана чалавекам. Мы гаворым пра палітычную, прававую, педагагічную культуру. У сувязі з гэтым заўсёды былі цяжкасці з міжведамасным характарам гэтай сферы. Напрыклад, калі мы гаворым пра бібліятэкі, то фармальна звяртаемся да Закона «Аб бібліятэчнай справе», дзе Міністэрства культуры ўпаўнаважанае вырашаць любыя пытанні, але на практыцы зрабіць гэта цяжка, бо бібліятэкі знаходзяцца ў падпарадкаванні самых розных ведамстваў. Наяўнасць кодэкса сведчыць пра новыя дасягненні надведамаснага ўзроўню развіцця культуры, пра агульнадзяржаўны падыход у гэтай сферы.

> **Рыгор СІТНІЦА:** Я заўсёды кажу: культура замацоўвае нацыю ў вечнасці. Гучыць пафасна, але гэта праўда. І загубіць яе вельмі проста. Дзякуй Богу, што з'яўляецца кодэкс — гэта сведчанне, што мы вырастаем «з дзіцячых штонікаў» і становімся дарослай краінай і дарослай нацыяй. Гэта сведчанне, што Беларусь сапраўды становіцца Беларуссю, бо шмат у каго (а мабыць, ва ўсіх у нас) усё яшчэ, і гэта не сакрэт, ёсць трывога: наколькі мы замацавалі сябе дзяржавай, наколькі гэта замацаванне трывалае? І вось кодэкс будзе сведчыць, што мы замацоўваемся.

Збліжаюцца нават тыя розныя сегменты нацыянальнай супольнасці, дзе па-рознаму бачаць развіццё нашай дзяржаўнасці. Гэта глабальны працэс.

«ЗВЯЗДА»: *Якія характэрныя рысы гэтага дакумента?*



Ігар Чарняўскі, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі

> **Ігар ЧАРНЯЎСКІ:** Для аховы спадчыны важна тое, што праект кодэкса мае пераемнасць з цяперашнім законам і разам з тым мае новыя падыходы — цэлы асобны раздзел па ахове археалагічнай спадчыны.

Бо ахова і правядзенне работ на помніку архітэктуры — гэта адно, а ахова і правядзенне работ на помніку археалогіі — зусім іншае. Акрамя таго, падчас работы над кодэксам выявілася, што некаторыя моманты ў сферы даследавання археалагічных аб'ектаў не ўрэгуляваны.

(https://pravo.by/novosti/obshchestvenno-politicheskie-i-v/)

У галіне аховы гісторыка-культуры таксама ёсць новыя падыходы, якія адлюстроўваюць выццёвыя рэаліі. Ёсць добры інстытут навуковых кіраўнікоў работ на аб'ектах гісторыка-культурных каштоўнасцяў, але на сённяшні дзень рэстаўрацыя закранае не толькі культуру, але і горадабудаўнічую сферу.

> Мы знайшлі формулу, якая замацоўвае адказных за правядзенне даследаванняў і распрацоўку праектнай дакументацыі на такіх аб'ектах і павышае статус такіх спецыялістаў.

Вельмі важна, што нам удалося іх захаваць.

Яшчэ адна добрая якасць будучага кодэкса — вывераная тэрміналогія.

Аляксандр СУША: Праект кодэкса ліквідуе існуючыя няўзгодненасці. Напрыклад, пры ажыццяўленні галерэйна-выставачнай і музейнай дзейнасці ў бібліятэках.

Святлана САРОКА: Адна з важных навацый кодэкса — дэфініцыя «культурныя даброты». Асаблівая ўвага надаецца людзям, якія маюць слабае фізічнае здароўе, інвалідам — культурныя даброты павінны быць даступныя кожнаму.

Ключавое паняцце «культура» ў праекце кодэкса даецца праз два складнікі: сукупнасць культурных каштоўнасцяў і культурную дзейнасць. Культурная дзейнасць уключае ў сябе больш за дзесяць напрамкаў. Да суб'ектаў культурнай дзейнасці дабавілі спонсараў і мецэнатаў. Культура прызнаецца галоўным фактарам самабытнасці беларускага народа.

Наталля КУЧЫНСКАЯ: Кодэкс мае пераемнасць з трывалымі нормамі існуючага заканадаўства, што выяўляецца ў першую чаргу ў захаванні зместу дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры. А гэта — захаванне, развіццё і распаўсюджванне беларускай нацыянальнай культуры і мовы, забеспячэнне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне ўмоў для адраджэння, захавання і развіцця нацыянальных культурных традыцый, забеспячэнне развіцця культуры ў сельскай мясцовасці. Захаваецца магчымасць доступу кожнага грамадзяніна да культурных каштоўнасцяў.

Адметнай рысай праекта лічу яго інавацыйнасць і адпаведнасць сучасным патрабаванням развіцця грамадства і дзяржаўнасці.

> Інавацыйныя ідэі і палажэнні тычацца супрацоўніцтва дзяржаўных органаў з камерцыйнымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, напрыклад, у рэалізацыі культурных праектаў, у сумеснай вытворчасці фільмаў, у арганізацыі і правядзенні культурных мерапрыемстваў.

Узрастае роля грамадскасці ў вырашэнні пытанняў культуры праз стварэнне пры мясцовых органах улады грамадскіх назіральных камісій па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне пры дзяржаўных органах грамадскіх саветаў, камісій, кансультацыйных органаў і экспертных фарміраванняў па пытаннях культуры. Можна працягваць далей…

У газеце «Звязда» падчас «круглага стала» на тэму беларускай нацыянальнай культуры ўзнікла пытанне: навошта рэгуляваць гэту сферу? Безумоўна, свабода творчай дзейнасці павінна заставацца недатыкальнай, і ў праекце кодэкса не закладзена рэгуляванне творчай дзейнасці, але маецца норма пра яе абмежаванне, калі адбываецца прапаганда жорсткасці, гвалту, экстрэмізму і падобнае.



Рыгор Сітніца, старшыня Беларускага саюза мастакоў.

> **Рыгор СІТНІЦА:** Што тычыцца свабоды творчасці, то я заўсёды падкрэсліваю, што вольны мастак павінен быць абсалютна вольны, але не вызвалены ад маральных прыярытэтаў.

Няхай мяне называюць маралістам, але я ўпэўнены, што дзве тысячы гадоў грамадства існуе толькі таму, што ў яго ёсць гэтыя прыярытэты. Калі б іх не было, то ўжо і мастацтва не было б.

Сёння любы можа назвацца мастаком, і разгортваюцца вялікія дыскусіі, ці варта вучыцца мастацтву. Не важна, што ты намаляваў, важна канцэпцыю напісаць. Любое смецце можна назваць перформансам, які выказвае нейкі пратэст.

> Я прымаю мастацтва на 360 градусаў і гатовы ўсюды шукаць пазітыўны вынік, але калі ідзе татальная прафанацыя, патрэбны нейкія шлюзы. Інакш адбываецца размыванне, і пакуль мы дачакаемся геніяльнага выніку, прафанацыя нас знішчыць, нам не застанецца пра што гаварыць.

Духоўны здабытак

«ЗВЯЗДА»: ***Кодэкс — гэта таксама культурны акт...***

Рыгор СІТНІЦА: І кожны народ праяўляе сябе праз гэтую творчасць па-свойму.

> Таму я хацеў бы, каб у кодэксе беларуская мова была запісана як аб'ект нацыянальнай культуры, якую дзяржава павінна абараняць.

У нас дзве дзяржаўныя мовы — гэта рэчаіснасць сучаснай Беларусі. Мне дзяржава гарантуе атрыманне інфармацыі на роднай мове. Але ў нас ёсць некаторыя тэлеканалы, дзе наогул няма беларускай мовы. Напрыклад, «СТБ». Я — глядач, падаткаплацельшчык. Чаму мае падаткі не апраўдваюцца?

«ЗВЯЗДА»: ***У законапраекце мова пазначана сярод нематэрыяльных каштоўнасцяў.***

Алена ВЕШТАРТ: Мы зыходзілі з таго, што культура — гэта тое, што створана чалавекам, звязана з чалавекам. Мова — важны элемент культуры, але адзін з яе складнікаў.

Рыгор СІТНІЦА: У нашым выпадку — галоўны, таму што не будзе мовы — не будзе дзяржавы. У праекце ж гаворка пра беларускую мову абмежавана адным словам і нават не названа, пра якую мову гаворка.



Алена Вештарт, начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры Беларусі.

Алена ВЕШТАРТ: У нас ёсць Закон «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», які рэгулюе пытанні выкарыстання беларускай мовы.

> У Кодэксе «Аб культуры» магчыма вызначыць сярод прынцыпаў, на якіх грунтуюцца грамадскія адносіны ў сферы культуры, прынцып прызнання беларускай мовы найважнейшым здабыткам беларускай нацыянальнай культуры.

Рыгор СІТНІЦА: Прапаную артыкул 70-ы Кодэкса «Аб культуры» дапоўніць пунктам «3»: «Беларуская мова з'яўляецца асноватворнай культурнай каштоўнасцю беларускага народа і Рэспублікі Беларусь. І пунктам «3.1»: «Беларуская мова як аб'ект культуры агульнанацыянальнага значэння знаходзіцца пад абаронай дзяржаўных органаў і забяспечваецца падтрымкай на ўсіх узроўнях грамадскага жыцця».

Тады я змагу ў любога чыноўніка запатрабаваць выканання гэтага закона. Моўнае пытанне фактычна цалкам здымае пэўныя моманты непаразумення ў грамадстве.

> **Святлана САРОКА:** Тэма мовы патрабуе асобнай гутаркі. Мова — найвялікшая святыня, першаэлемент духоўнай культуры. Гэта тое, што нас вылучае сярод народаў свету. Усіх нас хвалюе лёс нашай мовы. Нам трэба на высокім узроўні пагаварыць і пра культуру мовы, паколькі праблема тут ёсць.

На дзяржаўным узроўні пастаўлена пытанне аб тым, каб не даць беларускай мове выйсці з ужывання, загінуць. Гэта будзе першы кодэкс па-беларуску. Дарэчы, Міністэрства культуры — адзінае міністэрства наогул, дзе справаводства вядзецца на беларускай мове.

Наталля КУЧЫНСКАЯ: Кожны размаўляе на той мове, на якой яму зручна. Я, напрыклад, у жыцці часцей размаўляю па-руску, але асабісты дзённік і штотыднёвае планаванне вяду на беларускай мове, з задавальненнем чытаю беларускіх аўтараў, віншавальныя паштоўкі падпісваю па-беларуску. Зазначу, што стаўленне да беларускай мовы ў грамадстве прыемна змянілася. Гэта не мова правінцыі, як лічылі раней, гэта мова навуковай эліты, краязнаўцаў, творцаў. Калі я ішла на спектакль «Чайка» ў Купалаўскі тэатр, хвалявалася: як жа вялікі Чэхаў загучыць па-беларуску? Атрымалася прыгожа, вытанчана, глыбока.

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: Сёння Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» не перакладзены на рускую мову, і ўсіх гэта задавальняе.

Святлана САРОКА: Многія госці прыязджаюць у Беларусь, ім хочацца пачуць беларускую мову, а мы, беларусы, на жаль, не вельмі патрыятычныя да сваёй мовы.

Я асабіста размаўляю па-беларуску. І калі сустракаюся з кіраўніцтвам нашай краіны і гавару на беларускай мове, усе пераходзяць на яе і таксама прыгожа размаўляюць па-беларуску. Моладзь зараз цікавяць сустрэчы, святы, вяселлі ў духу беларускай культуры. У нас дзве мовы, але ёсць момант выбару, і часта прыклад іншых значыць шмат.

Вяртанне спадчыны

«ЗВЯЗДА»: ***Патрыётамі нас робіць гісторыя. Хачу вярнуцца да спадчыны, але ўжо матэрыяльнай. Ёсць тая яе частка, што апынулася за межамі Беларусі. Ці ёсць магчымасць вяртаць тое, што страчана? Якім чынам гэта адлюстравана ў кодэксе?***

(http://shop.belta.com.by/)

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: Вяртанне — паняцце абстрактнае. Цяпер трэба глядзець юрыдычна, як нашы каштоўнасці апынуліся за мяжой. Нам вельмі цяжка штосьці вярнуць з Масквы і Санкт-Пецярбурга, калі яно там апынулася да 1917 года. Фактычна мы жылі тады ў адной краіне — Расійскай імперыі, і, напрыклад, слуцкія паясы законна там апынуліся — у межах адной краіны. Тое ж з Варшавай, калі гаворка пра справы, якія рабіліся да падзелаў Рэчы Паспалітай. Але ёсць розныя формы вяртання. Гэтая работа ўжо і цяпер праводзіцца, хоць заканадаўства яшчэ няма.

Адна з формаў вяртання — перадача на дэпазіт (напрыклад, слуцкія паясы з Расіі, якія дэманструюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі). Правядзенне сумесных і абменных выстаў. Нарэшце, вяртанне ў выглядзе электронных копій. Калісьці Музей тэатральнай і музычнай культуры вярнуў такім чынам архіў Агінскага.

Праект Кодэкса «Аб культуры» нам дае больш канкрэтныя механізмы па паслядоўнай рабоце ў гэтым кірунку. Тэма вяртання складаецца з некалькіх прыступак: правядзенне даследаванняў, стварэнне агульнага рэестра (Інстытутам культуры Беларусі гэта якраз сёння і робіцца на базе сямі кніг — Адам Восіпавіч Мальдзіс даўно б'е ў званы). База ёсць для стварэння такіх каталогаў.

Наступныя крокі — супрацоўніцтва, наладжванне адносін. У рэкамендацыях ЮНЕСКА няма вяртання ў выглядзе рэстытуцыі. Рэстытуцыя магчымая толькі на пэўных падставах.

Што важна ў тэме вяртання, і чаму ў некаторых краінах яно паспяхова вядзецца? У Германіі гэтым займаюцца тры дзяржаўныя інстытуты, кожны мае свой бюджэт. Інстытут культуры Беларусі дамогся бюджэтных выдаткаў праз Камітэт па навуцы і тэхналогіях на распрацоўку згаданага каталога. Але гэтыя выдаткі скончацца...

Калі стваралася міжведамасная камісія пры Савеце Міністраў, Міністэрства культуры звяртала ўвагу, што на гэтую працу трэба мець не экспертную групу на гістарычным факультэце БДУ, а асобную арганізацыю з асобным бюджэтам. Можна нават міжведамасную, таму што Міністэрства замежных спраў праводзіць вялікую работу, выяўляе, наладжвае ўзаемаадносіны, каб каштоўнасці траплялі ў Беларусь. Шмат высілкаў прыклаў асабіста Уладзімір Шчасны. Шмат у гэтай справе залежыць ад асобы: даследчыка, адміністратара і фінансіста, які разумее, што трэба запланаваць на гэта грошы. Акрамя таго, што будучы кодэкс дасць прававыя падставы, вельмі важна, каб былі ўключаны арганізацыйныя механізмы. Такая работа не праводзіцца час ад часу.

Алесь СУША: Працаваць над вяртаннем сваіх нацыянальных скарбаў з-за мяжы, грунтуючыся на ўласным заканадаўстве, даволі цяжка. Найважнейшым з'яўляецца заканадаўства якраз тых краін, адкуль мы хацелі б нешта вярнуць (напрыклад, расійскае заканадаўства фактычна забараняе вяртанне іншым краінам іх скарбаў). У той жа час немцы маюць судовыя механізмы, адсочваюць, дзе што захоўваецца, гадамі вядуць перапіску, маюць на гэтыя задачы вялікае фінансаванне. Яны стварылі Фонд прускай культурнай спадчыны, які актыўна працуе гадоў 60 на збіранне раскіданай па свеце спадчыны Германіі.

Важны момант добрай волі ўладальнікаў. У плане заканадаўства з боку дзяржавы патрэбны некаторыя гарантыі, напрыклад, што каштоўнасць, прывезеная ў нашу краіну на выставу, будзе вернутая; важная наяўнасць механізмаў страхавання, транспартавання. Гэты механізм павінен мець міжведамасны ўзровень.

У бібліятэчнай сферы за апошні час мы прывялі шэраг мерапрыемстваў у Вільнюсе, Рызе, Лондане, Варшаве, Маскве, Пецярбургу, Празе, ва Украіне па альтэрнатыўных формах вяртання: арганізацыі выставак, атрыманне лічбавых копій кніжных помнікаў. Апошнія два гады актыўна працуем з беларускай дыяспарай.

Праца, якая раней вялася камісіяй «Вяртанне» на ўзроўні выдання асобных зборнікаў, будзе абагульнена ў спецыяльным дзяржаўным рэестры, стварэнне якога прадугледжана праектам кодэкса. Там працу трэба працягваць.

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: Падобныя інфармацыйныя рэсурсы павінны стаяць на трывалым дзяржаўным грунце. Ёсць, напрыклад, Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. Я расцэньваю гэты інфармацыйны рэсурс як надзвычай важны, які раскрывае ўсе бакі канкрэтнага аб'екта спадчыны, пачынаючы ад яго месцазнаходжання, аблічча і заканчваючы тым, што на ім адбываецца сёння. Калі гэты рэсурс пачне працаваць нармальна, то ён стане інструментам не толькі для дзяржаўнага служачага любога ўзроўню, але і кожны грамадзянін зможа атрымаць інфармацыю. Ёсць у нас неблагі рэсурс «Жывая спадчына», створаны дзякуючы фінансаванню ЮНЕСКА. Але што далей? Рэсурс павінен развівацца, працаваць.

Захаванне помнікаў гісторыі

«ЗВЯЗДА»: ***У праекце кодэкса ёсць пункты пра тое, што значыць статус нацыянальнага аб'екта спадчыны, прапісаны моманты, калі магчымае пазбаўленне статусу. Некаторыя моманты можна трактаваць і так, і так...***

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: Калі прафесійна з гэтым працаваць, то там няма двухзначнасці. Аўтэнтыка можа страціцца пры пэўных форс-мажорных сітуацыях: уздзеянні прыродных фактараў. А калі ў выніку дзейнасці чалавека, то вінаваты павінен панесці адказнасць. Калі хтосьці хоча пазбавіць гістарычны помнік статусу каштоўнасці, тады пракуратура разглядае гэтую праблему (была такая сітуацыя па Магілёве): а якія намаганні вы прыклалі, каб захаваць аб'ект?

Ёсць розныя формы захавання і аднаўлення аб'екта. Дарэчы, ва ўсім свеце прынятая такая тэндэнцыя, што не трэба кідацца адразу ўсё рэстаўраваць. Перш за ўсё трэба аб'ект закансерваваць. А далей, зыходзячы з таго, якія ёсць дакументальныя крыніцы, вырашаецца, ці магчыма яго аднавіць? Калі гаворка пра аўтэнтычнасць, мы павінны ведаць, як аб'ект выглядаў, які быў яго матэрыяльны змест.

«ЗВЯЗДА»: ***Палажэнні будучага кодэкса аб культуры фактычна адменяць папярэдні Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», які ў свой час лічыўся прарывам.***

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: Закон 1992 года меў некаторую дэкларатыўнасць: многія пытанні вырашаліся ў залежнасці ад таго, як хто глядзеў на праблему. У 1996 годзе фактычна прынялі новы закон з мноствам адсылачных нормаў, паводле якіх з'явіліся ўказы Прэзідэнта, пастанова Савета Міністраў, загады Міністэрства культуры. Праект кодэкса ўлічвае ўсе гэтыя прававыя нормы, аб'ядноўваючы іх у адным дакуменце. Хутчэй варта гаварыць пра эвалюцыйную пераемнасць.

Творчасць і побыт

«ЗВЯЗДА»: ***Ці дапаможа кодэкс рэальна ўдасканаліць працу і жыццё тым, хто культуру стварае?***

Рыгор СІТНІЦА: На вялікі жаль, я не знайшоў ніводнага палажэння, якое палегчыла б вырашэнне асноўнай праблемы, якая цісне Саюз мастакоў шмат гадоў.

Народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў у маразы вымушаны за сваю майстэрню плаціць па сем мільёнаў у месяц... Гэта плата за камунальныя паслугі: святло, вада, ацяпленне. Усе дагаворы на «камуналку» аформлены праз Саюз мастакоў, і мне ў адзін дзень выстаўляецца велізарная сума, якая павінна быць заплачана ў той жа самы дзень або на наступны.

Згодна з Законам «Аб творчых саюзах», майстэрні прыроўнены да бюджэтных арганізацый. У 1999 годзе гэта было для нас істотнай палёгкай. Але цяпер у Беларусі дзве катэгорыі памяшканняў: жытло і ўсе астатнія. Для мастакоў святло, вада і цяпло каштуюць у чатыры разы даражэй за сабекошт і ў дзесяць разоў даражэй за тое самае ў жылых кватэрах. Абсурд заключаецца ў тым, што творчыя майстэрні мастакоў па ўмовах аплаты за «камуналку» прыраўнаваныя да гаражных кааператываў...

Уся праблема ў тым, што платы ідуць праз саюз, але ж плаціць фізічная асоба. Сёлета нам у 10 разоў павялічылі адлічэнні на капітальны рамонт. Калі Кодэкс аб культуры адменіць Закон «Аб творчых саюзах», тады, магчыма, са мной у Міністэрстве эканомікі і Міністэрстве энергетыкі будуць гаварыць інакш.

Ёсць яшчэ адна праблема. Літаральна месяцы тры назад дзяржава была павінна Саюзу мастакоў 14,5 млрд рублёў за зробленую работу. На пачатак снежня — 6 млрд. Мы зрабілі дзелавы і культурны комплекс нашага пасольства ў Маскве. Выйгралі міжнародны конкурс, нас павіншавалі, дыпломы ўручылі, гран-пры — за інтэр'ер... І ні капейкі не заплацілі. Мы падалі ў суд, выйгралі — і нічога не атрымалі.

(https://shop.belta.ecom.by/)

Паколькі будзе другое чытанне, ёсць прапанова і датычная творчых саюзаў. Артыкул 62-гі дапоўніць пунктам «3»: «Дзяржаўныя органы спрыяюць забеспячэнню творчых работнікаў належнымі ўмовамі для творчай дзейнасці». І пунктам «3.1»: «вызначаюць кошт камунальных паслуг на індывідуальных працоўных месцах (у майстэрнях, студыях) членаў творчых саюзаў у адпаведнасці з тарыфамі на аплату камунальных паслуг, устаноўленых для насельніцтва».

У нас у Саюзе мастакоў больш за 1000 сябраў, якіх гэта тычыцца.

Папулярызацыя нацыянальнай культуры

«ЗВЯЗДА»: ***Мы жывём у эпоху інфармацыі, але ў праекце кодэкса няма часткі аб супрацоўніцтве са СМІ. Хоць культура — тая сфера, якую трэба папулярызаваць.***

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: У сферы аховы спадчыны сакрэтаў ні ад кога няма. Апошнім часам, праўда, журналісты здабываюць інфармацыю па тэлефоне, але я, каб даваць інфармацыю, хачу бачыць чалавека, яго вочы, хачу жывога кантакту.

Алесь СУША: Бывае такое, што ёсць унутраная «кухня», якую іншым разам не хочацца выстаўляць. Мне, можа, не хацелася б паказаць, як мы рыхтуем у Музеі кнігі тую ці іншую выстаўку, пакуль яна не адкрылася. Часам ёсць суб'ектыўны фактар канкрэтных кіраўнікоў, якія маюць асабісты вопыт кантактаў са СМІ. Для многіх істотная некаторая боязь за тое, што скажаш лішняе. На ўзроўні кодэкса, відаць, гэтыя пытанні не вырашаюцца, яны рэгулююцца іншым законам.

Рыгор СІТНІЦА: Ці можам мы назваць хоць адну папулярную перадачу, прысвечаную культуры, якая стаяла б у прайм-тайм на адным з нацыянальных тэлеканалаў, у якога вялікая аўдыторыя? «Беларусь 3» трэба доўга яшчэ працаваць, каб у яго была вялікая колькасць гледачоў. Але мне здаецца, што не на спецыяльным, а папулярным канале патрэбна нейкая перадача на ўзроўні ток-шоу. Памятаю, калісьці, напрыклад, была праграма «Страсці па культуры».



Святлана Сарока, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Святлана САРОКА: Ёсць тэлеканал «Культура», які, дарэчы, зняў праект «Маладзечна запрашае» і «Вечары ў Маладзечне» з канцэртнымі праграмамі вядучых творчых калектываў нашай краіны і выканаўцаў беларускай эстрады. За мінулы год у нас з'явілася больш перадач, куды запрашаюць людзей культуры, дзе гучаць розныя думкі.

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: Вельмі важна, каб у сродках масавай інфармацыі перадачы ці публікацыі былі прывязаны да пэўнага часу, каб ведалі, што гэтая тэматыка будзе ўзнятая. Раней праграмы кшталту «Спадчына» паслядоўна адсочвалі і падавалі тэму захавання культурнага і гістарычнага набытку, але цяпер гэта носіць несістэмны характар.

Рыгор СІТНІЦА: Мне б хацелася, каб кодэкс узняў увагу да нацыянальнай культуры. Але добра было б, каб сапраўды рабіліся такія захады, што людзі ў любым кутку Беларусі разумелі сутнасць паняцця «нацыянальная культура».

Святлана САРОКА: Сапраўды, роля сродкаў масавай інфармацыі вельмі важная. Неабходна распаўсюджванне інфармацыі аб культуры, аб тым, што робіцца ў гэтай сферы. Культуры патрэбна падтрымка як электронных, так і друкаваных СМІ.

Наталля КУЧЫНСКАЯ: Кожны з нас можа рабіць для папулярызацыі нацыянальнай культуры і вялікія, і малыя канкрэтныя крокі. Як дэпутат люблю дарыць нематэрыяльныя падарункі — прыгажосць і пазітыўныя эмоцыі. Па маім запрашэнні (і, безумоўна, пры дапамозе кіраўнікоў устаноў культуры) шэсцьдзесят дзяцей, што выхоўваюцца ў дамах сямейнага тыпу маёй акругі, ужо наведалі і цырк, і мюзікл, і Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, і Лідскі замак, і рэзідэнцыю Дзеда Зімніка, і дэльфінарый. Па маім хадайніцтве архітэктару будынка Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Віктару Крамарэнку, які атрымаў школьную адукацыю на Ашмяншчыне, прысвоена пачэснае званне «Ганаровы грамадзянін Ашмян». У нашым краязнаўчым музеі як падарунак жыхарам горада ладзім выставы маладых беларускіх мастакоў. На Іўеўшчыне разам з Інстытутам гісторыі адкрылі дзіцячы летнік, на працягу змены вучні дапамагалі археолагам праводзіць даследаванні.

Дадам, што праца над праектам Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» працягваецца. Рабочая група па дапрацоўцы праекта, якую я ўзначальваю, рыхтуе яго да разгляду ў другім чытанні. Мы бачым напрамкі ўдасканалення дакумента, чакаем заўваг і прапаноў спецыялістаў, дэпутатаў, грамадскасці — усіх, хто неабыякава ставіцца да нашага найвялікшага багацця — культуры. Сапраўды хочам падрыхтаваць сучасны дасканалы нарматыўны акт, што адкрые заканадаўчы калідор развіццю сферы культуры. Некаторыя думкі ў мяне наспелі за час нашай размовы. Абмяркуем на пасяджэнні групы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і Надзеі БУЖАН

Чытайце таксама

Новы профіль музеяў і віртуальныя карыстальнікі бібліятэк (/be/news/20220729/1659108664-novy-profil-muzeyau-i-virtualnyya-karystalniki-bibliyatek)

Чатыры стагоддзі беларускага буквара (/be/news/20220214/1644839939-belaruski-bukvar-kniga-yakaya-farmirue-nacyyu)

Арабскі рукапіс XIV стагоддзя на выставе «5+5+5» у НББ (/be/news/20210913/1631542961-arabski-rukapis-hiv-stagoddzya-na-vystave-555-u-nbb)

Краязнаўцы збіраюцца ў Шчорсах (/be/news/20210609/1623225595-krayaznaucy-zbirayucca-u-shchorsah)

(https://shop.belteleradio.by/)

Наколькі вядомы Уладзімір Караткевіч у свеце? Адказ шукаем разам з Аляксандрам Сушам (/be/news/20201012/1602516993-nakolki-vyadomy-uladzimir-karatkevich-u-svece-adkaz-shukaem-razam-z)

Тэгі:

Кодэкс аб культуры (/be/tags/kodeks-ab-kultury) | Наталля Кучынская (/be/tags/natallya-kuchynskaya) | Алена Вештарт (/be/tags/alena-veshtart) | Святлана Сарока (/be/tags/svyatlana-saroka) | Рыгор Сітніца (/be/tags/rygor-sitnica) | Аляксандр Суша (/be/tags/alyaksandr-susha) | Ігар Чарняўскі (/be/tags/igar-charnyauski) | Год культуры (/be/tags/god-kultury)

5986 праглядаў Друкаваная версія (/be/print/75157)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20160112%2F1452620427-shto-kodek
(https://connect.ok.ru/offer?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20160112%2F1452620427-shto-kode
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%A8%D1%82%D0%BE%20%D0%9A%D0%BE%D0%B4%D1%8D%D0%BA
(viber://forward?text=%D0%A8%D1%82%D0%BE%20%D0%9A%D0%BE%D0%B4%D1%8D%D0%BA%D1%81%20%
(https://t.me/share/url?url=http%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20160112%2F1452620427-shto-kodeks-ab

Навіны | Папулярнае

14:16 Навуковую і прафесійную траекторыю развіцця маладых спецыялістаў будучыя фізікі абмеркавалі з рэктарам БДУ (/be/news/20231117/1700214125-navukovuyu-i-prafesiynuyu-traektoryyu-razviccya-maladyh-specyyalistau)

13:55 Алейнік прыняў копіі даверчых грамат пасла Кыргызстана ў Беларусі (/be/news/20231117/1700218541-aleynik-prynyau-kopii-daverchyh-gramat-pasla-kyrgyzstana-u-belarusi)

13:30 Гара: арганізаваная злачыннасць і злачынствы ў сферы IT - адны з галоўных пагроз нацыянальнай бяспецы (/be/news/20231117/1700213391-gara-arganizavanaya-zlachynnasc-i-zlachynstvy-u-sfery-it-adny-z-galounyh)

13:08 Лукашэнка прыехаў на гомельскі ювелірны завод «Крышталь» (/be/news/20231117/1700215694-lukashenka-pryehau-na-gomelski-yuvelirny-zavod-kryshtal)

12:47 Мінсельгасхарч: больш за палову работнікаў сельскай галіны — жанчыны (/be/news/20231117/1700214447-minselgasharch-bolsh-za-palovu-rabotnikau-selskay-galiny-zhanchyny)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі з'явіліся новыя або абноўленыя сацыяльна-значныя аб'екты (/be/news/20231107/1699373532-va-usih-regiyonah-nashay-krainy-da-dnya-kastrychnickay-revalyucyi)

Беларускія прадпрыемствы прадставяць экспартны патэнцыял краіны ў Шанхаі (/be/news/20231025/1698249218-belaruskiya-pradpryemstvy-pradstavyac-ekspartny-patencyyal-krainy-u-shanhai)

Нашы грамадзяне павінны мець камфортныя ўмовы для працы і жыцця ў любым кутку Беларусі (/be/news/20231018/1697638442-yuryy-chabatar-nashy-gramadzyane-pavinny-mec-kamfortnyya-umovy-dlya-pracy-i)

Як мы глядзелі тэлевізар у маі. Дадзеныя медыявымяральніка (/be/news/20230608/1686222469-yak-my-glyadzeli-televizar-u-mai-dadzenyya-medyyavymyaralnika)

Як мы глядзелі тэлевізар у красавіку. Дадзеныя медыявымяральніка (/be/news/20230504/1683205382-yak-my-glyadzeli-televizar-u-krasaviku-dadzenyya-medyyavymyaralnika)

(https://shop.belteleradio.by/)

Выбар рэдакцыі

Грамадства (/be/gramadstva) (/be/news/20231116/1700145293-karespandenty-zvyazdy-nakiravalisya-u-reyd-z-uchastkovymi-inspektarami)

Карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ў рэйд з участковымі інспектарамі міліцыі Юліяй і Кірылам Башкевічамі (/be/news/20231116/1700145293-karespandenty-zvyazdy-nakiravalisya-u-reyd-z-uchastkovymi-inspektarami)

Калі служба — справа сямейная.

0 450

Здароўе (/be/zdarouе-0) (/be/news/20231116/1700150789-pneumaniya-paslya-covid-19-razvivaecca-u-3-5-paslya-grypu-u-30)

Пнеўманія пасля COVID-19 развіваецца ў 3-5%, пасля грыпу — у 30%! (/be/news/20231116/1700150789-pneumaniya-paslya-covid-19-razvivaecca-u-3-5-paslya-grypu-u-30)

Факты для тых, хто сумняваецца, прышчапляцца ці не.

0 821

Палітыка (/be/palityka) (/be/news/20231116/1700148545-uladzimir-andreychanka-my-vyhodzim-na-novy-uzroven-uzaemadzeyannya)

Уладзімір Андрэйчанка: Мы выходзім на новы ўзровень узаемадзеяння дзяржавы і грамадства (/be/news/20231116/1700148545-uladzimir-andreychanka-my-vyhodzim-na-novy-uzroven-uzaemadzeyannya)

Аб актуальных пытаннях будучай электаральнай кампаніі — у гутарцы са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў.

0 849

Сельская гаспадарка (/be/selskaya-gaspadarka) (/be/news/20231115/1700058262-yak-lyasnik-stau-fermeram-i-pasadziu-lesasad-dze-vyroshchvae-ekzatychnyya)

Як ляснік стаў фермерам і пасадзіў лесасад, дзе вырошчвае экзатычныя дрэвы (/be/news/20231115/1700058262-yak-

(http://zviazda.by/be/eleforum/)

Pyasnik-stau-fermeram-i-pasadziu-lesasad-dze-vyroshchvae-ekzatychnyya)

Арэхавая мара.

0 1786

Нашы партнёры:

(http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://www.belros.org/) (http://ww

(/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2023 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

6 177
4 157
3 986

(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

c h (https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://twitter.com/zviazda_by) (https://t.me/zviazda_by)